УДК 947, 6 «17/19»

# Пачатковая школа як сродак правядзення ў Беларусі ідэалогіі расійскага самаўладдзя (другая палова XIX пач. XXст.)

Багдановіч А. І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

З моманту станаўлення ў канцы XVIII – пач. XIX ст. сістэмы народнай адукацыі ў Расіі, яна стала адным з найважнейшых інстытутаў ідэалагічнага выхавання падрастаючага пакалення. Праўда, да сярэдзіны XIX ст. пачатковая адукацыя яшчэ не набыла масавага характару. Так у пачатку 60-х гадоў у Беларусі толькі каля 0,5% дзяцей школьнага ўзросту вучыліся ў школах. Асноўным тыпам народных школ заставаліся аднакласнае царкоўна-прыходскае вучылішча, або школа граматы. Найважнейшай задачай такой школы з’яўлялася навучанне грамаце, закону божаму, рэлігійнае і патрыятычнае (у духу адданасці цару) выхаванне дзяцей.

З 60–90-х гадоў XIX ст. ў сістэме пачатковай адукацыі Беларусі асноўнымі з’яўляліся царкоўна-прыходскія школы і народныя вучылішчы, якія паслядоўна праводзілі ў жыццё задачу сфармуліраваную Віленскім генерал-губернатарам М.М. Мураўёвым. Ён ў маі 1864 года ў запісцы на імя цара выказаўся за неабходнасць умацавання і ўзвышэння ў краі рускай народнасці і праваслаўя праз распраўсюджанне грамадскай адукацыі.

З канца XIX–пач XX ст. пачатковая школа, стала адным з найважнейшых сродкаў ажыццяўлення ідэалогіі Расійскага самаўладдзя ў Беларусі. Па-першае, яна паслядоўна выхоўвала падрастаючае пакаленне ў духу адданасці цару і праваслаўнай царкве; па – другое, у азначаны перыяд хутка расце колькасць пачатковых школ і колькасць навучэнцаў у іх, а разам з гэтым узрастаюць магчымасці выкарыстаня пачатковай школы як ідэалагічнага інстытута дзяржавы; па – трэцяе, змест пачатковай адукацыі ва ўсіх тыпах школ кантраляваўся Свяцейшым Сінодам, які ў гэты час практычна стаў галоўным ідэалагічным інстытутам дзяржавы; па – чацвертае, больш шчодрым дзяржаўным фінансаваннем царкоўна-прыходскіх школ ў параўнанні са школамі падпарадкаванымі Міністэрттву асветы; па – пятае, ажыццяўленем жорсткага ідэалагічнага кантролю з боку царквы за прафесійнай дзейнасцю настаўнікаў пачатковых школ, іх прыватным жыццём, іх дабранадзейнасцю і лаяльнасцю ў дачыненні да царквы і манархіі.